**Наша сіла ў адзінстве**

Кучынская Анастасія, вучаніца VI класа,
дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Забалацкая сярэдняя школа імя
Я.Н.Карпянкова" Воранаўскага раёна

Звычайны асенні дзень. Яркае сонца шчодра аддае сваё апошняе цяпло. Еду ў аўтобусе разам з аднакласнікамі.

Прыгожы горад Ліда. Экскурсавод апавядае пра паходжанне назвы горада, пра яго славутыя мясціны. Раптам заўважаю на сцяне шматпавярховага дома надпіс на беларускай мове: "вуліца 17 Верасня". Мяне зацікавіла незвычайная назва і я ўдакладніла пра яе паходжанне ў экскурсавода. І ўсе, хто быў у аўтобусе, пачулі змястоўны аповед пра вельмі важную гістарычную падзею нашай краіны. 17 верасня 1939 года адбылося аб'яднанне Усходняй і Заходняй частак Беларусі, беларускі народ стаў жыць у адной краіне. У 2021 годзе гэты дзень аб'яўлены Днём народнага адзінства, гэтае свята кожнаму беларусу нагадвае пра тое, што сіла нацыі, сіла народа ў адзінстве: адзінстве думак, спраў, дзеянняў, учынкаў. У гонар народнага адзінства і названа вуліца ў горадзе Лідзе.

Як жылі нашы продкі я ведаю з твораў літаратуры, кінафільмаў і энцыклапедыі. Пра тое, якім было жыццё ў Заходняй Беларусі да 1939 года ўяўляю, бо прачытала твор Янкі Брыля "Сірочы хлеб". Там якраз ідзе аповед пра маіх равеснікаў-беларусаў, якія вымушаны былі размаўляць і вучыцца ў школе толькі на польскай мове. Нават уявіць складана, што за кожнае сказанае на роднай беларускай мове слова, маглі жорстка пакараць чалавека. Вучыцца на беларускай мове не было магчымасці. Багатыя аднакласнікі кпілі з бедных. Было шмат сірот, а сваякі вельмі часта жылі ў розных частках Беларусі і прыехаць не маглі адзін да аднаго. Так было да 1939 года.

Пра адзінства народа можна гаварыць, успамінаючы падзеі Вялікай Айчыннай вайны. На барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ішлі ўсе неабыякавыя, усе, хто не жадаў бачыць, як боты чужынцаў топчуць родную збалелую зямлю, як свішчуць кулі над галавой, як гінуць у агні беларускія вёскі разам з жыхарамі. Побач змагаліся людзі розных нацыянальнасцей і рознага веравызнання. Іх аб'ядноўвала адзіная мэта: перамагчы ворага і заваяваць мір. У адзінстве народа, яго згуртаванасці – сіла і вялікая моц, а калі народ адзіны, то ён непераможны.

Зруйнаваныя гарады зноў вярнуліся да жыцця дзякуючы адзінству беларускага народа, які змог аднавіць прамысловасць, народную гаспадарку, пабудаваць жылыя дамы і школы. Гэта вялікі і важны ўрок для нас, пакалення дваццаць першага стагоддзя. Мы павінны памятаць, што толькі разам, толькі ў адзінстве мы зможам захаваць самае дарагое, што маем: мір, незалежнасць, упэўненасць у сваёй будучыні.

Думаю, што кожны чалавек павінен разумець, што пачынаць трэба з самога сябе і адказаць на пытанне: "Што я зрабіў ці магу зрабіць для сваёй Радзімы, свайго народа?" Лічу, што пачаць можна з пошуку адказу на пытанне:

“Якія добрыя справы мною зроблены для сваёй вёсачкі, дзеля сваіх родных і сям’і?”

Я з вялікай упэўненасцю магу сказаць, што мае родныя, мая сям’я – гэта адзінства, адзінае цэлае. Так здарылася, што тры гады назад памерла мая матуля, засталася мы жыць разам з татам. Аднак і гэта была не апошняя трагедыя ў маім жыцці: у мінулым годзе нябёсы забралі ў мяне і тату. Гэта вельмі страшна. Кажуць, што чалавеку ад нараджэння даюцца два крылы: тата і мама, вельмі цяжка ляцець з адным крылом, а тым больш ісці пяшком. Вельмі добра разумею гэта зараз. Адна я не засталася, бо побач са мной заўсёды была любімая цёця Таня, сястра таты. Яна прыняла мяне ў сваю сям’ю, атуліла цеплынёй, пяшчотай. Я заўсёды адчуваю яе падтрымку і клопат. У сваю чаргу старанна вучуся, дапамагаю цётачцы ў хатніх справах. Хіба гэта не прыклад адзінства, адзінства сям’і, родных і блізкіх людзей?

Так павінна быць і з народам. Толькі пераадольваючы агульнымі намаганнямі цяжкасці, праблемы і рознагалоссі ў грамадстве, можна жыць у прыгожай, незалежнай, багатай, квітнеючай краіне. Мы не маем права забываць гісторыю і павінны берагчы сваю Радзіму. У характары беларусаў працавітасць, жыццёвая мудрасць і разважлівасць, спагадлівасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу, добразычлівасць і гасціннасць. І я ўпэўнена, што гэтыя рысы дапамогуць нам жыць у міры і згодзе, захаваць адзінства нацыі, незалежнасць роднай краіны, роднай зямлі.